


## «АЛЬПІНІСТЫ» — «ШАХЦЁР»... Хто каго?

Жыццё Таісы і яе шалапутнага Жэніка праходзіла і праходзіць пад дэвізам «І вечны бой, спакой нам толькі сніцца!». Прычына вайны банальная: Жэня злоўжывае, як той казаў... Таіса (пакуль) змагаецца, а галоўнае — з усіх сіл стараецца шмат што не браць да галавы.

У нядзелю нашаму герою ўдалося добра «намурзацца» — з сябрам замачыць яго новы матацыкл.

У панядзелак з раніцы — пад «бой» званоў у галаве — праслухаць Тасіну лекцыю пра шкоду алкаголю ды яго наступстваў і, страціўшы надзею на сто грамаў, ужо сабрацца на работу і тут, у апошнюю хвіліну перад выхадам, заўважыць, што жонка палезла на гарышча. «Па кілбасу, нябось? — заславаўся Жэнік. — Дык я ж табе зараз...»

Пад сцягам помсты ў яго падужэлі рукі ды так, што ён не проста падхапіў досыць цяжкую лесвіцу і паклаў на зямлю, а яшчэ і прыхаваў за хлявом: пасядзі, маўляў, даражэнькая, падумай, як трэба да мужа ставіцца.

«Не на тую напаў!» — убачыўшы адсутнасць «трапа», усміхнулася яго баявая сяброўка. А далей толькі і засталося, што звязаць паміж сабой дзве прасціны, якія сушыліся на гарышчы, ды спусціцца ўніз.

...Пад вечар Жэнік з выглядам трыумфатара зайшоў у хату і абалдзеў, бо заспеў сваю Тасю ў кампаніі суседкі за паяданнем бульбы з катлетамі... Але ж выгляду не падаў — як мага весялей прамовіў:

— Прывітанне альпіністам!

— І табе не хварэць! — гэтак жа ласкава адгукнулася жонка, а потым дадала: — У Іры ўнучка нарадзілася. Дык яе бутэлечку мы ўжо таго — выпілі... Схадзі ты, Жэнечка, у склеп: за бочкай з агуркамі я слоічак самагону схавала.

Узрадаваны «пасланец» пры гэтым зусім не заўважыў, як пакруглелі вочы суседкі, у якой ніякай унучкі нават у «праекце» не было, і галопам панёсся на вуліцу.

Пакуль мацаў за бочкай, дзе ж той слоік, неяк раптам... сцямнела.

Не адразу нават дайшло, што ў склепе... зачыніліся дзверы — на жалезную штабу, на замок.

З паўсутак там мужчына трымаўся (гэта вам не гарышча — тут шанцаў нуль, бо сцены — з камянёў ды цэменту...). Разважаў пра жаночае вераломства, пра гаротны мужчынскі лёс і марнасць чалавечага жыцця наогул.

Потым, калі бразнула штаба і ў яго «турму» ўварваўся зыркі сонечны промень, панура выпаўз наверх і ўжо рот нават адкрыў, каб агучыць сваё цвёрдае рашэнне падаць на развод, як пачуў Таісіна мядовае «Прывітанне шахцёрам!»...

Пасля чаго плюнуў, махнуў рукой і моўчкі пайшоў у хату, бо вельмі ж хацелася есці.

**А. Навасельская,**
*Мінскі раён.*

## РУКА КАЛАЦІЛАСЯ, ДЫ ГРОШЫ БРАЛА

Да наступлення пенсіённага ўзросту Мікола Макарчук шмат гадоў адпрацаваў кіроўцам аўтобуса, але ж адносіны з аўтапаркам не парываў і пасля: па просьбе адміністрацыі маляваў розныя аб'явы ды шыльды, трафарэты з раскладам руху, якія затым вывешвалі на прыпынках. А заадно — смяшыў калег сваімі байкамі. Ды такімі ж складнымі, што не разабраць было, дзе — праўда, а дзе — хлусня!..

Што-ніштo з гэтых выдумак напярэдадні першага красавіка Мікола адсылаў нават у раёнку. І, мусіць, шмат хто з чытачоў за чыстую манету прымалі гісторыі пра тое, што ў азярыне каля аўтабазы плавае невялічкі кракадзіл ці пра тое, што ў райаддзеле міліцыі ён асабіста ўжо зарэгістраваў самагонны апарат, бо санстанцыя, зрабіўшы аналіз яго прадукцыі, прызнала гарэлку цалкам прыдатнай для ўжывання (праўда, без права продажу, прынамсі, пакуль).

Але ж найболей Міколавых баек — пра сяброўкіроўцаў і пра... сябе. Тут і зараз толькі адна:

— Я часта вазіў людзей у сталіцу. Неяк раз і Таня, жонка мая, напрасілася — захацела сястру праведаць. «Добра, — кажу, — выходзь а палове дзявятай на вуліцу: буду ехаць з аўтавакзала — падбяру».

Як дамовіліся, так зрабілі. Уселася мая палавінка на сядзенні, што побач са мной, пытае: «Коля, а грошы за праезд табе аддаваць?» «Не трэба, — пачынаю тлумачыць. — Я што, за трыццаць гадоў, што сяджу за рулём, не зарабіў сабе права на бясплатны праезд?.. Сам нiколі не карыстаюся, дык хоць ты праедзеш.

А тым часам ужо і Мінск. Жонка пайшла да сваякоў, я другі рэйс зрабіў з Узды ў сталіцу, назад — ужо і Таню вязу.

Села яна побач ды расказвае, якім каньяком частавалі, як пляменнікі падраслі... А потым — нешта прымоўкла: глядзіць на маю руку, што трасецца (ад вібрацыі) на рычагу пераключэння перадач і кажа: «Бачу, Колечка, што ты хвалюешся... А раптам і праўда кантралёр? Дык на вось грошы, давай білет — зайцам я не паеду».

Што рабіць? Усміхнуўся, са скрыначкі з грашыма дастаў жонцы квіток (нехта з пасажыраў не ўзяў), яна і паспакайнела: з білетам у руках аж да нашай вуліцы даехала. А там ужо і выйшла.

Іншых пасажыраў я адвёз на вакзал, пусты аўтобус загнаў на базу, па дарозе за жончыны грошы ўзяў пляшку «Маскоўскай». А дома, бачу, і вячэра на стале. Я да яе бутэльку: наліў нам з жонкай па кроплі за ўдалую паездку і... сэканомленыя грошы. Прызнаўся, карацей, у сваёй афёры.

«Што пачуў у адказ, лепей не ўспамінаць, — смяяўся Мікола. — Але пасля той маралі грошы такім чынам я болей не эканоміў: не збядненем мы, калі праезд аплацім.

**Віктар Сабалеўскі,**
*г. Узда.*

## НЕ КАЖЫ... ГАЎ!

Мае дзеці нарадзіліся ў канцы сямідзясятых, калі мама яшчэ працавала ў калгасе, і таму ім абодвум — і сынку, і дачушцы, — можна сказаць, «пашчасціла» папрацаваць і на гародах ды сенакосах, і на сапраўдных абшарах цукровых буракоў, каб зарабіць сваёй бабулі пенсію.

Але ж гэта — пазней, калі дзеці трохі падраслі, а пакуль былі малымі, гулялі то ў хаце, то на двары, найчасцей весялілі ды цешылі нас, дарослых... Засмучалі хіба што зрэдку.

...Гэта і сапраўды: гаспадарку весці — не штамамі трэсці. Тут і розум патрэбен, і досвед, а найболей — здароўе і сілы на штодзённую цяжкую працу: каб гародніну вырасціць (тую ж бульбу-буракі для свіней), каб дроў назапасіць, каб сена для кароўкі было (не адной) на ўсю доўгую зімку.

Дык вось. На сенажаці той воз нам дасушыць не ўдалося: сыраватым яго прывезлі дамоў. Па дарозе вырашылі ў гумно пакуль не складаць, каб не збуцвела — скінулі ў двары... Во ўжо дзецям шчасце было! Вакол кучы бегалі, уверх на яе залазілі, у хованкі гулялі, у «падножжы» сядзелі, а ўрэшце Лёшка новы фокус прыдумаў... Убачыў, што бабуля з пашы сустрэла кароўку, як падвяла да кучы з сенам, як уладкавалася на зэдлічку, каб яе падаіць, паслухаў, як цурчыць малачко; зайшоў за «стог», пастаяў за ім, затаіўшыся, — падкраўся да рагулі, а потым як выскачыць, як гаўкне на яе!

Рыжма знянацку ажно падскочыла — ударыла нагой па дайніцы (а магла б, крый бог, па «даярцы»). Вядро паляцела ў адзін бок, бабуля — у другі, малако — белай рэчкай — пацякло ў трэці...

Дзядуля, які ўсё гэта бачыў, не стрымаўся: падхапіў нейкі дубчык і рушыў да любімага ўнука.

Той, бедны, сцяміў, што трэба ўцякаць: куляй паляцеў за хату. Дзядуля — за ім. Лёша сігануў на разлапістую бярозу... Дзед — следам. Малы ўзбіраўся вышэй і вышэй, стары не адставаў, аж пакуль не зразумеў, што дзіця ўжо досыць высока...

Толькі тады паціху-паманьку спусціўся ўніз, але ж усё роўна прысеў пад дрэвам на лаўку: перакрыў унуку «шлях да адступлення», бо надта ж хацеў «пачаставаць» бярозавай кашай!

...Калі я па нешта выйшла на двор, яны так і сядзелі: Лёша НА бярозе, дзядуля — ПАД.

Бабуля тым часам падаіла Рыжму, адправіла дзеда, каб у хату занёс малако, а мы сталі казаць малому: «Ну, годзе!.. Ну злазь, а то ножкі самлеюць... Дзядуля больш не злуецца».

Толькі тады Алёша нясмела спусціўся з дрэва і гэтак шчыра паабяцаў, што болей гаўкаць не будзе, што мы рассмяяліся.

А малы, і праўда, — не падмануў.

**В. Бабко-Аляшкевіч,**
*в. Радкава,*
*Салігорскі раён.*

**Рубрыку вядзе Валянціна ДОЎНАР.**

***Ад яе ж (і Фаіны Раневскай):***

*«Жыццё занадта кароткае, каб марнаваць яго на дыеты, скупых мужчын і дрэнны настрой». Пішыце!*




Малюнак Анатоля ГАРМАЗЫ.

Неасабісты суб'ектыў



# ФОРМУЛА ДАРОСЛАСЦІ

### Пра тое, што не падкажа гугл

Да Дня пажылых людзей я заўсёды старалася прывезці ім іхнія любімыя цукеркі — імпартныя, у пластыкавым акуратным пачку з бліскучай абгорткай, шакаладныя з цэльнымі арэхамі ўсярэдзіне. Кожны раз матуля спачатку ўздыхала: «Гэта ж дорага», пасля задаволена хавала пачастунак у буфет са словамі: «Ну вось, першага чысла з Шурай паласуемся...» Першага кастрычніка суседка цётка Шура прыходзіла да яе, або яна ішла да суседкі, і пачыналі «святкаваць» — налівалі ў чаркі па некалькі кропель каньяку ці самаробнай настойкі на чорнай рабіне, даставалі тыя цукеркі, заварвалі гарбату і сядзелі-гаманілі аб сваім. «Адзначаем сваё «прафесійнае свята»! — бадзёра дакладвалі мне па тэлефоне. — Мы, канешне, яшчэ ніякія не пажылыя (адной было за семдзесят, другой — за восемдзесят), але калі нагода ёсць, дык чаму б і не пасядзець»...

Часам, як сёлета, Дзень пажылых людзей прыпадаў на выхадныя, і тады да іх «шаноўнай бяседы» далучалася я. Было ў ёй нешта такое сумна-светлае, пранізанае халаднаватым сонцам, як і ўсё кастрычніцкае наваколле. Яны сядзелі, спакойна, нікуды не спяшаючыся, «падводзілі вынікі» дачнага сезона: што ўрадзіла, а што — не вельмі, планавалі наступны: што і дзе варта пасадзіць на вясну, праўда, апошнія гады заўсёды з агаворкай: «Калі Бог дасць дажыць». Гаварылі пра дзяцей, унукаў, праўнукаў. Смяяліся, успамінаючы цікавыя выпадкі з жыцця па суседстве. Плакалі, гаруючы па сваіх дарагіх, маладзейшых, што ніколі не будуць пажылымі: мама згадвала любімага зяця, які памёр у 42, цётка Шура — дачку, якую наркаман-сусед забіў, калі той было няпоўных 54. Хутка супакойваліся, на нейкі час замаўкалі і прасветленымі вачыма глядзелі кудысьці ўдалеч, упэўненыя ў недалёкай сустрэчы з тымі, каго страцілі... Пасля, як і належыць паважаным вясковым кабетам, пачыналі абмяркоўваць мясцовыя навіны, даючы свае трапныя, не заўсёды лагодныя, ацэнкі. Асабліва даставалася мясцовым выпівохам, калі хтосьці з іх праштрафіўся — заснуў пад плотам, не дайшоўшы дадому, напрыклад... Сядзелі доўга, а чаркі так і заставаліся недапітымі, цукеркі — недаедзенымі. Павольна разыходзіліся, раннім надвячоркам запальвалі святло ў сваіх вялікіх пустых хатах, якія калісьці поўніліся шматлікімі галасамі, і свяціліся гэтыя вокны ў восеньскай цемры ледзь не да раніцы...

Ужо не першы год тыя адмысловыя італьянскія цукеркі купляць няма для каго. Зноў, зайшоўшы ў краму перад паездкай у вёску, прайду, не спыніўшыся, паўз паліцу з бліскучымі пластыкавымі пачкамі — і на нейкі зусім кароткі міг прамільгне: вось куплю — і ўсё будзе як раней. У вёсцы ў ранніх прыцемках мы запалім святло на ўсю хату, будзем сядзець за сталом, падводзіць вынікі дачнага сезона: што ўрадзіла, а што не вельмі, планаваць наступны: што і дзе варта пасадзіць на вясну. Але гэта ўсё не тое, не так — упохапкі, мітусліва, баючыся кудысьці спазніцца, штосьці не паспець... Я так і не навучылася ў іх гэтай спакойнай разважлівасці, калі ўсё робіцца своечасова, але не спяшаючыся, калі цэніцца кожная хвіліна жыцця, калі знаходзіцца час на тое, што сапраўды для цябе па-чалавечы каштоўна і важна. Пэўна, гэта прыходзіць з узростам.

А пакуль іх навукі вельмі не хапае. У іх, мудрых старэйшых жанчын, можна было вучыцца ўвесь час. Нават ужо ў дарослым узросце, маючы вышэйшую адукацыю, прафесійны досвед і пасаду. Вучыцца таму, чаму не вучаць ні ва ўніверсітэце, ні на рабоце. Цярпенню. Уменню пераводзіць у гумар нават самыя крытычныя сітуацыі. Шчырай рэакцыі на гора і на радасць: плакаць не сароменючыся, рагатаць ад душы, а не прыкрывацца сарамліва далонькай. Працавітасці. Усякім жыццёвым важным дробязям — гэта ж так здорава, калі табе за сорак, а ёсць у каго бездапаможна спытаць: «Мам, я забылася, а колькі солі класці ў тыя агуркі?» — і быць упэўненай, што тут жа атрымаеш дакладны адказ і агуркі выйдуць смачныя, як заўсёды... Ведаць, што, колькі б табе ні было гадоў, ёсць хтосьці мудрэйшы, больш вопытны, хто абавязкова падкажа, што і як рабіць, калі ты разгубішся або забудзешся...

Мне здаецца, што наша пакаленне — апошняе, якое не адмаўляецца спасцігаць і прымаць гэту важную навуку старэйшых. Тыя, каму сёння трыццаць-плюс, і маладзейшыя — іншыя. Хтосьці з вядомых псіхолагаў-філосафаў ужо даўно вывеў формулу дарослaсці. Маўляў, чалавека нельга лічыць дарослым, пакуль ён не перастане думаць: як у такіх тупых бацькоў нарадзіўся такі геній, як я. Калі браць яе да ўвагі... у нас вельмі мала дарослых трыццацігадовых людзей, не кажучы ўжо пра маладзейшых. Бацькі? Бабулі з дзядулямі? Што іх слухаць, гэта ж мінулае стагоддзе. Яны ж нават смартфонам карыстаюцца з цяжкасцю — чаму яны могуць навучыць? Саліць агуркі? Гугл у дапамогу, і пры чым тут бабуля... А вось павучыць старэйшых жыццю, раскласці па палічках, што і як яны няправільна ў ім, жыцці, зрабілі з пункту гледжання прагрэсіўнай псіхалогіі (не там вучыліся, не з тымі ажаніліся, не так харчуюцца, не так рэагуюць на нейкія падзеі) — гэта калі ласка, гэта заўсёды і з ахвотай.

Я за імі назіраю, і мне іх шкада. Дарослымі яны стануць рана ці позна. Калі не будзе каго павучаць і ад каго адмахвацца. Калі ніхто ўжо не назаве «дачушка» або «сынок». Калі раптам захочацца проста спытаць, на якую тарку церці бульбу на бабуліны калдуны або што гэта за дзядзька на фота ў альбоме, — а спытацца не будзе ў каго. Калі ахіне халодная безвыходная пустэча і гэта адчайна-беззваротнае «раней трэба было».

Зрэшты, можа, яно будзе зусім інакш. Пабачым. Калі дасць Бог дажыць, як казалі мае любімыя маладыя бабулі, адзначаючы сваё «прафесійнае свята» і будуючы планы на наступную вясну.

**Алена ЛЯЎКОВІЧ.**